# СВАБОДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

№ 30(79), 9-15. 08. 2007 г.


# ГАРОТА

## ХТО МОЖА БЫЦЬ ГАРАНТАМ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ БЕЛАРУСІ?

Яшчэ зусім нядаўна можна было не сумнявацца, што пераважная большасць упэўнена адкажа на гэтае пытанне – прэзідэнт Лукашэнка. Газавы канфлікт з Расіяй на пачатку году, здавалася, толькі ўмацаваў гэтае меркаванне. Тады кафлікт нагадваў, хутчэй, нейкае палітычнае шоў, дэманстрацыю мускулаў і магчымасцяў з абодвух бакоў. Лукашэнка толькі ўмацаваў свой імідж барацьбіта за незалежнасць краіны.

Сёння сітуацыя выглядае значна больш вострай і сур'ёзнай.

Апазіцыйныя эканамісты (сярод іх – Міхал Залескі, напрыклад) да апошняга часу цвердзілі, што Лукашэнка не пойдзе на саступкі Маскве. Ён не будзе выплочваць ніякія пазыкі і ўрэшце ўсё застанецца так, як было дагэтуль. Вядомыя палітолагі казалі, што кіраўніку РБ выгадная палітычная сітуацыя ў Расіі, што да прэзідэнцкіх выбараў Крэмль не захоча канчаткова псаваць адносіны з адзіным хаўруснікам, што яму застаецца ўсяго толькі пачакаць…

Але ж сёння мы бачым, што Лукашэнка пачаў плаціць – у самым непасрэдным і ў пераносным сэнсах — па старых рахунках. У яго не засталося выйсця. Справа ў тым, што Беларусь расплочваецца за расійскую сыравіну сваім золтавалютным запасам. А з ліпеня ўжо трэба расплочвацца за газ па поўнай праграме – то бок, па сто даляраў за куб. А неўзабаве – і яшчэ больш. Расійскія ўлады на чале з прэзідэнтам Пуціным павольна, але няўмольна зацягваюць эканамічную пятлю на шыі РБ. (У Іспаніі гэты від смяротнага пакарання называўся гарота).

Калі кіраўнік РБ кажа, што загадаў свайму прэм'еру не ездзіць больш у Маскву – гэта значыць, насамрэч, што Масква ня хоча больш мець справу не столькі з Сідорскім, колькі з ягоным шэфам. Лукашэнка раптам адкрыў усяму свету сакрэт – Масква хоча "прыватызаваць" не толькі ўсе буйныя прадпрыемствы, але ўсю Беларусь цалкам. Тады ўзнікае пытанне – чаму ён гэтым сакрэтам палішынеля падзяліўся толькі праз дванаццаць гадоў свайго праўлення? Навошта былі патрэбныя рэферэндум аб саюзе і сама "саюзная дзяржава"? Няўжо нікому не прыходзіла да галавы, чым гэтыя гульні ў інтэграцыю могуць скончыцца?

Але самая галоўная праблема — у іншым. Абсалютна няясна, як, за кошт якіх унутраных рэзерваў цяперашні рэжым можа ў сапраўднасці процістаяць імперскаму націску Масквы, калі эканоміка РБ завязаная на расійскія газ і нафту? Адказ падаецца відавочным. Бюджэт можна папоўніць не столькі за кошт венесуэльскіх ці якіх заўгодна крэдытаў, колькі за кошт нармальнай эканамічнай палітыкі. Замест таго, каб навязваць прадпрымальнікам кабальныя ўмовы існавання, прымушаць іх выцягваць за ўласны кошт нерэнтабельную сельскую гаспадарку (свайго роду сучаснае прыгоннае права) — чаму не даць ім рынкавую свабоду, як ва ўсім свеце і не напоўніць бюджэт за кошт нармальных падаткаў? Але даць эканамічную свабоду – значыць, у нейкай ступені разняволіць грамадства ў цэлым. А менавіта да гэтага рэжым сёння не гатовы.

Дык хто ж можа стаць у гэтых умовах гарантам незалежнасці Беларусі?




**«Перамога альбо смерць!** *Мы пераможам».* **www.polit.ru**

**Аляксандр Уласаў**


**Працяг тэмы на стар. 2,4**


## УДАР! ШТАНГЕ!

### СПОРТ І ПАЛІТЫКА


НА СТАР. 5


## ВЫГНАННЕ Ў РАЙ

### ЭСЭ АЛЕГА АБЛАЖЭЯ


НА СТАР.7

# ХТО СЁННЯ МОЖА БЫЦЬ ГАРАНТАМ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ БЕЛАРУСІ?

**Працяг тэмы з 1-й старонкі.**

**РЫГОР СІТНІЦА, МАСТАК:**

## "МІЖНАРОДНАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ, НАРОД І БОГ"

Гарантамі незалежнасці Беларусі, наколькі я ведаю, з'яўляюцца некалькі краін, у тым ліку і Расія. Калі ўзгадаць міжнародныя пагадненні пачатку 90-х гадоў і калі звяртацца да міжнароднага права, то гэтыя краіны і мусяць нам гарантаваць нашу незалежнасць. Гэта першы гарант. Другі – гэта беларускі народ, які, ўсё ж такі, сябе ў некаторых момантах можа праявіць так, як ніхто не чакае. Можа быць, гэта нават найпершы гарант. Здаецца, што ўжо ніякіх спадзяванняў у нейкія крытычныя моманты, а пасля раптам раз – і думаеш, адкуль што ўзялося? Госпад Бог галоўны гарант нашай незалежнасці. І апошні гарант, як ні дзіўна, гэта ўладныя структуры, якія, як ніхто, зацікаўленыя сёння ў гэтай незалежнасці. Бо яны не дурныя людзі і ведаюць, што ў іх могуць узнікнуць вельмі сур'ёзныя праблемы пры яе адсутнасці. Апошнім часам іх становіцца ўсцешна слухаць.

**УЛАДЗІМІР, МЕНЕДЖЭР:**

## "ТОЛЬКІ МОВА…"

Калі мы назіраем перайменаванне праспекта Скарыны ў праспект Незалежнасці, то не трэба пытацца. І так усё зразумела. Калі мы кажам пра незалежнасць у святле газавых крызісаў, тады Еўропа не столькі за незалежнасць, колькі за прадказальнасць Беларусі. Сапраўднага гаранта незалежнасці трэба шукаць не звонку, а ўнутры. А адзінае, што робіць людзей гэтай тэрыторыі беларусамі – гэта беларуская мова. Толькі яна можа дапамагчы беларусам адчуць сябе грамадзянамі краіны, а не жыхарамі рэспублікі. Таму толькі мова ёсць гарантам незалежнасці. А што тычыцца нейкай асобы... Калі з'явіцца адчуванне краіны, тады з'явіцца і асоба, і партыі і гэтак далей. А пакуль гэтага адчування няма, дык гарантыяў даводзіцца шукаць недзе звонку.

**ЗОЯ, ПЕНСІЯНЕРКА:**

## "ТОЙ ГАРАНТ, АД КАГО ЎСЁ ЗАЛЕЖЫЦЬ"

Толькі той, ад каго найбольш усё залежыць і ўсе залежаць. Падабаецца гэта каму ці не, але гэта Аляксандр Лукашэнка. Сёння толькі ён можа нешта гарантаваць. І пакуль ён з гэтым някепска спраўляецца.

**ВІНЦУК ВЯЧОРКА, СТАРШЫНЯ БНФ:**

## "СЁННЯШНЯЯ ЎЛАДА НЕ МОЖА БЫЦЬ ГАРАНТАМ"

Галоўны гарант незалежнасці Беларусі – гэта воля самога беларускага народу. Гэта яго адчуванне, што незалежнасць ёсць каштоўнасцю. І, дзякуй Богу, паводле апошніх сацыялагічных замераў абсалютная бальшыня – ад 73-х да 84-х працэнтаў беларусаў – лічаць, што незалежнасць ёсць вельмі значнай каштоўнасцю. Гэта наша нацыянальная ідэнтычнасць. Гэта беларуская мова, якую прызнае роднай бальшыня людзей і рэальна ўжывае бальшыня людзей. Гэта рэальная, а не фантомная гістарычная памяць. Гэта нацыянальная сімволіка. Гэта архітэктурнае асяроддзе. Карацей кажучы, усё тое, што разбураецца сённяшняй уладай. З чаго, дарэчы, вынікае, што хто-хто, а яна ніяк не можа быць гарантам нашай незалежнасці.

**ВЕРАНІКА, СТУДЭНТКА:**

## "ТОЛЬКІ ТЫЯ, ДЛЯ КАГО БЕЛАРУСЬ – НЕ ПУСТЫ ГУК"

Толькі тыя, для каго Беларусь – не пусты гук. Хто гатовы дзеля яе, прабачце за высокія словы, ахвяраваць усім. І такіх у Беларусі нямала. Прынамсі, іх значна болей за ўсіх гэбэшнікаў, ідэалагічных работнікаў і амапаўцаў разам узятых. Дзейнасць не за грошы, не за пасаду, не за матэрыяльныя даброты ў перспектыве заўжды дасць плён.

**АЛЕСЬ АНЦІПЕНКА, ФІЛОСАФ:**

## "ГАРАНТАМ МУСІЦЬ СТАЦЬ ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ"

Хто можа быць гарантам незалежнасці Беларусі – гэта даволі вузкае пытанне. Трафарэтны адказ – гэта, вядома, прэзідэнт. Але насамрэч гарантам незалежнасці Беларусі ў нашай сітуацыі можа быць і мусіць быць грамадзянская супольнасць. У нашай сітуацыі гарантам незалежнасці павінны быць палітычныя партыі і звычайныя грамадзяне. Вось той набор, які з'яўляецца базавым. Што да міжнародных суб'ектаў, то ёсць, безумоўна, прававыя дакументы, якія, у пэўным сэнсе, гарантуюць незалежнасць. Некаторыя краіны, калі выводзілася ядравая зброя з тэрыторыі Беларусі, сталіся гарантамі нашай незалежнасці. Гэта міжнародныя суб'екты. Але, безумоўна, незалежнасць – гэта вытворнае жаданне волі і дзейнасці людзей унутры краіны.

**ТАЦЯНА, ХАТНЯЯ ГАСПАДЫНЯ:**

## "НІХТО НІЧОГА ГАРАНТАВАЦЬ НЕ МОЖА"

Ніхто. У сённяшняй сітуацыі, калі ад людзей, для якіх незалежнасць Беларусі каштоўнасць, нічога не залежыць, ніхто нічога гарантаваць не можа. Хіба толькі Бог.

**ГЕНАДЗЬ БУРАЎКІН, ПАЭТ:**

## "БЕЛАРУСКІ НАРОД ПАВІНЕН БЫЦЬ ГАРАНТАМ"

Гарантам незалежнасці Беларусі павінен быць толькі беларускі народ, беларускае грамадства. А што да персонаў, дык калі яно будзе дастаткова разумным, дастаткова прынцыповым, гэтае наша роднае беларускае грамадства, яно з гэтым вызначыцца. Але пакуль народ не будзе сябе адчуваць беларускім, пакуль не будзе даражыць сваёй гісторыяй і тым, што ён ёсць у свеце, тым, што яму даў Бог, то астатнія гаранты будуць можа і добрымі, можа, своечасовымі, але ненадзейнымі і не вечнымі. А народ, паколькі ён вечны, павінен быць гарантам.

# СТУДЭНТ АБАРАНЯЕ СВАЕ ПРАВЫ

Мінскі гарадскі суд пад старшынствам Міхаіла Басава цалкам задаволіў прыватную скаргу былога студэнта Акадэміі кіравання пры прэзідэнце РБ Юрыя Алейніка. Студэнт-выдатнік быў адлічаны з 4-га курсу Акадэміі сёлета 15 траўня – нібыта за прагулы. Аднак Юры Алейнік лічыць, што сапраўдная прычына адлічэння – ягоная грамадзянская пазіцыя і палітычныя погляды. Паводле рашэння суду справа Алейніка вяртаецца зноў на разгляд у суд першай інстанцыі.



**Юры Алейнік** *перад будынкам гарадскога суду. Мінск, 6 жніўня 2007 году.*

Раней суд Кастрычніцкага раёна сталіцы спыніў справу паводле скаргі Юрыя Алейніка да Акадэміі кіравання. Суд палічыў гэтую справу непадведамаснай яму. Сёлета ў красавіку 2007 году Юры Алейнік удзельнічаў у зборы подпісаў пад зваротам да дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў за захаванне сацыяльных ільготаў студэнтам. Ён старшыня Мінскай абласной арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны.

**Паводле РС**

# БЕЛАРУСЬ СЯРЭДНЯВЕЧНАЯ

## Меркаванне рэдакцыі

*Сёлета ў верасні на цэнтральнай пляцоўцы «Лініі Сталіна» пройдзе III Міжнародны рыцарскі фэст «Беларусь сярэднявечная». Арганізатары запрасілі на фэст "рыцараў" з клубаў Беларусі, Чэхіі, Польшчы, Украіны, Расіі, краінаў Балтыі. Беларусь будуць прадстаўляць клубы «Унія Меч і Крумкач», «Ордэн Паўночнага Храма» і яшчэ каля 30 рыцарскіх аб`яднанняў. Аб гэтай радаснай падзеі паведамляе дзяржаўная газета "Звязда".*

Трэба думаць, рыцарскі турнір гэтым разам прымеркаваны да 70-й гадавіны масавага тэрору ў СССР. Акурат увосень 1937 году пачаліся



**Шарж. Алег Бяседзін**. *Карикатура.ру*

расстрэлы і ў Беларусі. Яго ахвярамі ў той год (паводле афіцыйных звестак) сталі 12 тысяч чалавек – у іх ліку лепшыя прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі. Сярод удзельнікаў касцюмаванага шоў, напэўна, будуць і ўнукі альбо праўнукі ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў. Асабліва кранае ўдзел у ім рыцараў з Польшчы і краінаў Балтыі, якія былі акупаваныя Савецкім Саюзам у выніку ганебнага Пакту Молатава-Рыбентропа.

Можна, канечне, зразумець арганізатараў свята на "Лініі Сталіна", якія не бачаць у гэтым нічога, акрамя магчымасці зарабіць грошы. Можна зразумець удзельнікаў – відаць, у юных адэптаў "ордэна Паўночнага храма" і яму падобных у галовах няма нічога, акрамя жадання пакрасавацца ў рыцарскіх даспехах. Што возьмеш з падлеткаў і юнакоў? Сталін для большасці з іх – нехта накшталт фараона Рамзэса другога.

Хай і для турыстаў гэта ўсяго толькі повад хоць нешта цікавае паглядзець у краіне, дзе гістарычная спадчына, помнікі нацыянальнай культуры свядома вынішчаюцца.

Але чаму ўсе аўтамабілісты, якія едуць па шашы Мінск-Маладэчна вымушаныя ў раёне "Лініі Сталіна" скідваць хуткасць да 70 кіламетраў у гадзіну, як таго патрабуе дарожны знак? Нават калі шаша абсалютна пустая. Толькі для таго, каб мець магчымасць палюбавацца бюстам "правадыра ўсіх народаў" і тым самым прадэманстраваць павагу да монстра?

У якім жа стагоддзі загразла сённяшняя Беларусь?

# ПАЛІТЫКІ ПРА "ГАЗАВЫ КАНФЛІКТ"

"Сёння за спінай беларускага народу адбываецца злачынны патаемны гандаль, які вядзе да распродажу нацыянальнага багацця і да страты суверэнітэту". З такой заявай у сувязі з чарговым газавым канфліктам выступіў вядомы палітык Аляксандр Мілінкевіч. "За прыгожымі лічбамі афіцыйнай статыстыкі хаваецца банкруцтва і некампетэнтнасць кіроўных колаў паслядоўна адстойваць нацыянальныя інтарэсы і праводзіць неабходныя эканамічныя рэформы. Бюджэтныя грошы марнуюцца на нікому не патрэбную ідэалагічную вертыкаль і БРСМ, на шматлікія сілавыя структуры і органы кантролю, на стратныя прадпрыемствы, на будаўніцтва лядовых палацаў. Насельніцтва і прадпрыемствы ўжо даўно плацяць па рынкавых коштах за карыстанне газам, а выгандляваная ў Расіі розніца застаецца вузкаму колу прыўладных чыноўнікаў".

У якасці выйсця з сітуацыі А.Мілінкевіч прапануе пераход эканомікі на рынкавыя рэйкі, а ў палітычным плане – дыялог з удзелам уладаў, апазіцыі і ўсяго грамадства.

Са сваім каментаром чарговай "газавай атакі" выступіў лідэр беларускіх кансерватараў Зянон Пазьняк. Ён звязаў гэтую атаку "з праблемай захавання ўлады КГБ у Расіі і найперш асабіста Пуціна ў сувязі з заканчэннем яго кадэнцыі і новымі выбарамі". Аднак, "Лукашэнка ўжо даўно не валодае стратэгічнай палітыкай унутры краіны", — лічыць З.Пазьняк. Тым часам, выйсці з гэтай сітуацыі не складана. "Трэба праводзіць нацыянальную палітыку, унутраную і замежную, зыходзіць з нацыянальных інтарэсаў. Але для Лукашэнкі гэта чыста тэарэтычнае пытанне. Бо перакрочыць праз сябе, праз нянавісць да беларушчыны ён у прынцыпе не здольны ніколі. Ён будзе змагацца за сваю скуру, як пацук, і цягнуць за сабой на дно ўсю Беларусь".

# ЗАГАЗАВАНЫ ЖНІВЕНЬ

## УЛАДЫ РБ ЗАГНАЛІ СЯБЕ Ў ЗАГАННАЕ КОЛА

Па даўгах трэба плаціць. Гэтую аксіёму расійскі «Газпром» на мінулым тыдні вымушаны быў даводзіць кіраўніцтву РБ яшчэ раз. І, трэба сказаць, зрабіў гэта з поспехам – бадай, такога імпэту ад расейцаў улады ў Мінску не чакалі.

Беларусь павінна была пералічыць «Газпрому» 450 мільёнаў даляраў запазычанасці за газ, пастаўлены сёлета ў першым паўгоддзі, да 23 ліпеня. Аднак у належны тэрмін умовы кантракту не былі выкананыя – грошы на рахунак расійскай кампаніі з Беларусі не паступілі.

Афіцыйны Мінск вырашыў яшчэ раз праверыць Маскву на трываласць. Туды паляцела дэлегацыя чыноўнікаў «Белтрансгазу» і Мінэнерга – узгадняць адтэрміноўку плацяжоў.

Як бы там ні было, перамовы поспеху не мелі. Як і візіт прэм'ера Сідорскага ў Маскву ды ягоная сустрэча з кіраўніком расійскага ўраду Фрадковым.

Урад Беларусі з аплатай цягнуў у разліку ці то на цуд, ці то на расійскі крэдыт у 1,5 мільярда даляраў, які Мінск прасіў яшчэ ў лютым. Масква з крэдытам не спяшалася і не дэманстравала гатовасці ісці на саступкі. У Расіі былі ўпэўненыя – грошы на аплату пазыкі ў Беларусі ёсць.

Па-першае, хоць Беларусь згодна з кантрактам ад 31 снежня 2006 году першыя паўгады плаціла за газ толькі 55% яго кошту (100 даляраў за кубаметр), беларускія спажыўцы ўжо са студзеня плацілі за яго па поўным кошце. Фактычна, атрыманыя за гэта грошы павінны былі назапашвацца для выплаты запазычанасці ў ліпені. Па-другое, на пачатку чэрвеня "Газпром" пералічыў Беларусі 625 мільёнаў даляраў за 12,5 % акцыяў "Белтрансгаза" (што таксама было ўмовай кантракту). Беларусі заставалася выплаціць расійскаму боку 450 мільёнаў даляраў.



**Чарга на пункце** *запраўкі балонаў звадкаваным газам. Мінск, 2 жніўня 2007 году.*

Відаць, таму ў Маскве гэтым разам не сталі доўга цырымоніцца. 1 жніўня "Газпром" выступіў з заявай – калі грошай у абумоўлены тэрмін не будзе, 3 жніўня пастаўкі газу ў Беларусь будуць зніжаныя паводле фактычнай аплаты – г.зн., на 45 %.

Увесь дзень 1–га жніўня афіцыйныя асобы ў Мінску маўчалі. І толькі наступным днём Лукашэнка падчас свайго наведання газеты "Советская Белоруссия" не вытрымаў.

Кіраўнік дзяржавы абвінаваціў Расію ў тым, што яна хоча прыватызаваць не толькі асобныя беларускія прадпрыемствы, але ўсю Беларусь.

Што ж, менавіта да гэтага, відавочна, імкнецца расійская эліта. Але хто стварыў адпаведныя ўмовы для гэтага цягам апошніх гадоў? Хто ўвесь час жыў у пазыку, закалыхваючы крэдытора казкамі пра саюзную дзяржаву? І чаго ж цяпер абурацца?

Нервы ў Лукашэнкі не вытрымалі. «Сёння я даў каманду ўзяць з рэзерваў гэтыя грошы і заплаціць 450 мільёнаў", — заявіў ён 2 жніўня.

Дык значыць, грошы сапраўды былі. Чаму ж было не заплаціць без скандалу, як тое прадугледжана кантрактам?

У адказе на гэтае пытанне сыходзяцца практычна ўсе эксперты: калі ўлада выплаціць запазычанасць перад расійскай манаполіяй, у яе не застанецца сродкаў на шматлікія сацыяльныя выплаты насельніцтву Беларусі. То бок, без знешняй дапамогі "беларускі эканамічны цуд" існаваць будзе нядоўга. У гэтым і хаваецца нежаданне плаціць. Рост коштаў расійскіх нафты і газу выбіў грунт з-пад ног афіцыйнага Мінска, які прызвычаіўся жыць за кошт расійскіх датацыяў. І менавіта гэтая сістэма, якая складвалася гадамі, ляжыць у аснове сённяшніх прэтэнзіяў Крамля на тое, каб купіць у Беларусі ўсё, што магчыма. Газавы вентыль – пераканаўчы аргумент.

У выніку Лукашэнка здаўся. Нацбанк Беларусі перавёў "Газпрому" ў кошт пагашэння доўгу 190 мільёнаў даляраў і абяцаў выплаціць да 10 жніўня рэшту ўсяе сумы.

Сваёй пагрозай скараціць пастаўкі газу Масква, якая ўжо страціла на Захадзе імідж надзейнага пастаўшчыка энергарэсурсаў, зноў паказала – у справе ўшчування даўжнікоў яна не спыніцца ні перад чым.

Ці можна лічыць інцыдэнт вычарпаным? Наўрад ці. Хутчэй за ўсё, Мінск запазычанасць за газ сапраўды выплаціць цалкам. Тут не бачна іншага вайсця. Але хутка надыдзе тэрмін наступнага плацяжу, і ўсё можа паўтарыцца зноў.

Лукашэнка ў кожным выпадку будзе шукаць падставы адпомсціць Расіі.

Мала хто звярнуў увагу на заяву намесніка міністра энергетыкі Беларусі Эдуарда Таўпянца аб тым, што "сёння "Белтрансгаз" – гэта ўжо не чыста беларуская арганізацыя, гэта арганізацыя беларуска-расійская… І ў статуце яе ёсць пункт, які прапісвае, што беларускія і расійскія акцыянеры не павінны рабіць дзеянняў, скіраваных на пагаршэнне эканамічнага стану гэтага СП".

Да чаго вядуць падобныя развагі? Калі Мінск паспрабуе паставіць пад сумнеў здзелку аб продажу пакету акцыяў Белтрансгаза Газпрому і пачне на яго ціснуць – можна не сумнявацца, усе ранейшыя газавыя канфлікты пададуцца нам толькі кветачкамі.

Праўда, застаецца магчымасць пайсці на сур'ёзныя саступкі Расіі. Напрыклад – дазволіць расійскім кампаніям прыватызаваць прадпрыемствы паліўна-энергетычнага комплексу Беларусі. Атрымліваецца заганнае кола, у якое ўлады РБ самі сябе загналі. Перамагчы ў гэтай сітуацыі ўжо немагчыма. Дай Бог выйсці з яе з найменшымі стратамі.

**Алег Ман**

## НАМІ ПІШУЦЬ СМС

Прачытаўшы некалькі нумароў газеты "Свабода", я хацела б атрымаць інфармацыю аб палітыцы ў нашай краіне. Калі вам не цяжка, дашліце мне некалькі папярэдніх нумароў. Хачу разабрацца, ці ўсё сапраўды так дрэнна ў нашай краіне.

**З павагай Войніч Карына.**

*(Заўвага: на жаль, рэдакцыя не мае магчымасці высылаць нумары газеты з архіву. Падпішыцеся!)*

Мужыкі! Скажу шчыра: робіце выдатную газету! Адчуваецца высокі прафесіяналізм. Шкада, што не ведаю галоўнага рэдактара, але, па ўсім відаць, гэта чалавек кампетэнтны ў журналістыцы. Газета перадаецца з рук у рукі і гэта найвышэйшы гонар для яго.

Навошта Лукашэнку ўставаць на калені, калі ён яшчэ не ўстаў з іх?

# УДАР! ШТАНГЕ!..

## СПАДЧЫНА СЯБРА САДАМА

Зборнай Беларусі па футболу нарэшце знайшлі замежнага спецыяліста. Яе ўзначаліў Берндт Штанге, які быў агентам дзяржбяспекі ва Ўсходняй Нямеччыне і галоўным трэнерам нацыянальнай каманды Ірака пры Садаме Хусэйне.

Кар'ера гэтага трэнера пачалася ў ГДР у сямідзясятыя гады мінулага стагоддзя. Яна была досыць паспяховай. Спачатку Штанге прывёў клуб "Карл Цэйс" да перамогі ў чэмпіянаце краіны, а потым цягам шасці гадоў стаяў на чале зборнай ГДР.

Але пасля аб'яднання Германіі былі адкрытыя архівы "Штазі" – гэдээраўскай таймай паліцыі, якая мала чым рознілася ад сумна вядомага гітлераўскага гестапа. І высветлілася, што Штанге з'яўляўся ейным неафіцыйным супрацоўнікам. У яго абавязкі ўваходзіла інфармаванне спецслужбаў пра палітычныя погляды ды настроі падначаленых. Таксама Штанге мусіў пільна сачыць, ці кантактуе хто-небудзь з каманды з грамадзянамі "варожай" ФРГ.

У выніку Штанге быў звольнены з берлінскага футбольнага клуба "Герта". Пасля ён колькі часу працаваў на постсавецкай прасторы, трэніраваў клуб "Перт Глоры" з Аўстраліі. Узначаліў нацыянальную каманду Амана, з якой быў звольнены праз тры месяцы. І, нарэшце, у кастрычніку 2002-га падпісаў сапраўдны кантракт з д'яблам – стаў галоўным трэнерам зборнай Ірака.

"Я працаваў з камуністычнымі рэжымамі, з капіталістамі, з султанатам і цяпер вось з дыктатарам, — апраўдваўся Штанге. Але мая праца заўсёды адна і тая ж – забіць мяч у вароты".

Сапраўды, спорт па-за палітыкай. Але толькі не ў выпадку з Садамам. Што ўяўляў з сябе іракскі футбол тых часоў, нядаўна распавёў часопіс Maxim.



**Бернд Штанге** *ў форме трэнера нацыянальнай зборнай Беларусі на прэс-канферэнцыі. Мінск, 30 ліпеня 2007 году.*

Пасля прыходу да ўлады Хусэйн адным з першых расстраляў старшыню Іракскай футбольнай асацыяцыі Фалеха Акрама. А праз пяць гадоў прызначыў кіраўніком ІФА свайго сына Удэя.

Усе, хто чымсьці не падабаўся сыну дыктатара, зніклі ў турме, і целаў іхным сваякам не выдавалі. Аднойчы Удэю данеслі, што вядомы журналіст Тарык Абдул Вахаб у тэлефоннай размове сказаў пра іракскі футбол, што той пакідае жадаць лепшага. Кіраўнік ІФА загадаў арыштаваць і закатаваць "паклёпніка". Руку, якой журналіст трымаў тэлефонную трубку, раструшчылі малатком, а вуха, да якога ён трубку прыціскаў – адрэзалі.

Цэнтрам спартыўнай імперыі Удэя быў будынак Алімпійскага камітэту, які сын дыктатара ўзначальваў па сумяшчальніцтве. Там ладзіліся оргіі, падчас якіх шмат пілі, гвалтавалі скрадзеных жанчын і час ад часу стралялі ў столь і вокны. А ў падвале знаходзілася міні-турма, дзе "выхоўвалі" спартоўцаў, якія так ці йнакш "звінаваціліся".

Іракскі гулец Нік Аск распавядае: "У футболе Удэй зусім не разбіраўся. Аднак ён быў перакананы, што калі лупцаваць гульцоў як след, тыя дакладна перамогуць каго заўгодна – нават бразільцаў".

Калі ж яны цярпелі паразу ў міжнародных сустрэчах, іх бязлітасна каралі. У 1993 годзе Ірак прайграў Іярданіі. Пасля гульні былі арыштаваныя чатыры гульцы, у тым ліку абаронца Шарар Гейдар.

«Нас білі чатыры дні амаль без перапынку, — успамінае ён. — Дазвалялі толькі некалькі гадзінаў паспаць на падлозе. Ахоўнікі будзілі нас і патрабавалі, каб мы лавілі мух, але выключна самак. Калі мы не маглі злавіць муху, нас білі. Калі нехта лавіў муху, ахоўнікі заяўлялі, што гэта самец, і зноў пачыналі нас біць..."

Вось з такімі катамі супрацоўнічаў Штанге, заплюшчваючы вочы на іхнія подзвігі. Не дзіва, што на радзіме ягоная рэпутацыя сапсаваная ўшчэнт.

Але тое, што на Захадзе мінус, для цяперашніх уладаў РБ – плюс. З усіх магчымых кандыдатаў яны абралі менавіта Штанге...

Свой беларускі этап трэнер пачаў з падману. Калі пару тыдняў таму да Штанге датэлефанаваліся журналісты "Прэсбола", ён заявіў, што прыехаў у Мінск з адзінай мэтай – пабачыць сяброў. А ўзначаліць зборную Беларусі яму ніхто не прапаноўваў.

А ўжо 30 ліпеня ён быў афіцыйна прызначаны галоўным трэнерам зборнай Беларусі.

Логіка чыноўнікаў ад футболу, якія прымалі гэтае рашэнне, зразумелая. Ім найперш патрэбны лёкай, які ніколі не будзе пярэчыць ці крытыкаваць. Перакананы, што неўзабаве мы пачуем ад Штанге, як шмат робіцца ў нашай краіне дзеля развіцця спорту і што Беларусь – вялікая футбольная нацыя (так ён ужо гаварыў пра Ірак). А калі ягоная трэнерская місія, як і большасць апошніх, скончыцца правалам, немец знікне з далягляду без прэтэнзіяў. Тое, што і трэба.

Адна толькі паралель павінна бянтэжыць Аляксандра Лукашэнку. Праз паўгода пасля прызначэння Штанге Хусэйн быў адрынуты ад улады. А гісторыя часам мае звычку паўтарацца...

**Валер Філін**

**P.S.** А тым часам нацыянальная зборная Ірака ўпершыню ў гісторыі выйграла Кубак Азіі па футболу – пад кіраўніцтвам зусім іншага трэнера. Перамогу зборнай святкавала, без перабольшання, уся краіна. Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя.

**В.Ф.**

Саюздрук

# ЭКСКУРСІЯ З БАБАЙ-ЯГОЙ

## АЛЬБО ЯК НАКОНТ НАТА Ў АДЭСЕ?

Цвіком мінулага тыдня стаў рэдакцыйны каментар "Советской Белорусии" наконт цалкам прагназаванай рэакцыі кампаніі "Газпром" на спробу беларускага ўраду не плаціць па рахунках.

*«Газпром» вызывает отвращение россиян, как жиреющий спрут, демонстративно «гуляющий» на глазах миллионов работяг, с трудом сводящих концы с концами. «Газпрому» — мало! К своим несметным богатствам он хочет присоединить все более–менее ценное, что есть в Беларуси. (...)Разве так ведут себя друзья в трудную для другого минуту, разве это достойно братьев–славян?"*

Добра. А што ж для братоў-славян годнасць? Можа, паставіць подпіс пад дамовай, якую не збіраліся выконваць? Цібратам-славянам увогуле не трэба плаціць?

У 2009-м годзе Мірскі замак цалкам адкрыецца для турыстаў. Уладзімір Пракапцоў, дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея, філіялам якога ёсць замак, паехаў, так бы мовіць, зірнуць на аб'ект. Пра свае адчуванні спадар Пракапцоў распавёў "Советской Белоруссии".

*"Мирский замок требует от поселка современного уровня туристических услуг, а чашку кофе здесь по–прежнему можно выпить лишь в одной «Рагнедзе», и то растворимого. (...) Колорита нет, национального колорита. Для туриста это — катастрофа. В гостинице, в холле и в номерах — вы сами видели — на стенах висят пластмассовые картины–сувениры в китайском стиле. Уму непостижимо: в таком историческом месте, где каждый камень на мостовой может «заговорить», если его грамотно обыграть, мы предлагаем любоваться синтетическим ширпотребом. А качество сувениров — тарелок, колокольчиков, которые предлагаются в палатке возле замка? Довольно низкого художественного уровня, да и настоящего выбора керамики нет. Итак, что в итоге предлагается туристу Мирского замка после экскурсии? Купить довольно безвкусный глиняный колокольчик и сфотографироваться с... Бабой–Ягой! И это около «цветка средневековья»! Примитивно. Наши предки сослали бы нас на конюшню"*.

Думаю, што нашы продкі ўвогуле далей стайні вас і не пусцілі б. І пра які гэта камень на бруку згадвае спадар Пракапцоў? Увесь брук з мірскіх вуліц панішчаны падчас еўрарамонту 2002 году. "Пагаварыць" цяпер можна толькі з бетоннай плітачкай. А калісьці, яшчэ да "рэканструкцыі", філіжанку выдатнай натуральнай кавы можна было выпіць у прыватнай кавярні з відам на замак. Кавярню прыдушылі падаткамі, каб забяспечыць кліентуру дзяржаўнай сталоўцы "Рагнеда". Відаць, не забяспечылі. Таксама не ўяўляю, хто селіцца ў мірскім гатэлі – за сорак баксаў у суткі. Сапраўды, катастрофа. Але на для турыстаў. Бо турыстам ёсць куды вяртацца…

А газета "Рэспубліка" дае рэпартаж з "акупаванай" войскамі НАТА Адэсы. Прынамсі, такое ўражанне ўзнікае пры чытанні тэксту.

*"В нынешней Одессе, кроме известных на весь мир достопримечательностей ... можно увидеть и многочисленные митинги. Это одесситы протестуют против возможного вступления Украины в НАТО. То есть это, может быть, кто-то в других регионах страны считает, что такое возможно.*

*В Одессе – городе русской, а потом и советской воинской славы, и просто независимой по своему духу — очень сильны антинатовские настроения и нежелание стать чьей-то колонией. А потому даже в эти летние жаркие денечки, когда приехавший сюда турист стремглав бежит на пляж, одесситы отчаянно митингуют.*

Сведчу, што ўсё напісанае праўда. Бо сам быў у Адэсе і бачыў той палымяны мітынг. На Прыморскім бульвары, каля помніка Рышэлье сем агрэсіўных бабулек і адзін дзядок трымалі плакаты "Настоящий одессит НАТО в дом не пригласит". Публіка асцярожна абыходзіла гэтую кампанію, ніяк не рэагуючы. Тады мітынгоўцы самі пачалі чапляцца да несвядомай публікі, каб людзі нешта там падпісвалі. Каб вярнуць савецкіх патрыётак да парадку, з'явіўся слуга пранатаўскага рэжыму. (Рэдкі для Адэсы выпадак! Пасля лукашэнкаўскага Мінска адчуванне такое, што міліцыі ва Ўкраіне ўвогуле няма.) Міліцыянт спачатку быў аблаяны, але пасля кароткай размовы старычкі прымоўклі. І трэба прызнаць, сваю нішу яны знайшлі. Побач прагульваліся касцюмаваны Багдан Хмяльніцкі ды мужык з малпай. Для здымкаў за грошы. Мне падалося, курортнікі ахвотней здымаліся на фоне чырвонасцяжнага пікету. Грошай не бяруць, а вось экзотыкі – больш.

**Алесь Канюціч**

Як робяцца хвалі

# ЦЯПЛЕЙ, ЦЯПЛЕЙ…

## АЛЬБО "ПАРЭШТКІ ДОЎГУ"

У вуснай мове ёсць такая амаль няўлоўная далікатная асаблівасць – інтанацыя. На пісьме гэта цяжка перадаць, але паспрабую. Дык вось, да нядаўняга часу шаноўнае Еўрарадыё раздражняла ненатуральнымі інтанацыямі вядучых. Быў абраны якісьці штучна-іранічны стыль, што мусіў імітаваць жывы FM-эфір. Але цяпер, дзякаваць Богу, гэтае шалупінне аблязцела, і слухаць Еўрарадыё – адна прыемнасць. Гучаць проста маладыя бадзёрыя і, падкрэслю, натуральныя галасы. Вось яшчэ б і калегам з Радыё Рацыі крытычна прыслухацца да свайго гучання на сярэдніх хвалях. Трохі менш сталёвай механістычнай напорыстасці і больш жывых, цёплых таноў.

У мінулым аглядзе я разважаў пра вандроўныя перадачы на Радыё Свабода, а гэтым разам хачу зачапіць аналагічныя праграмы на Радыё Рацыя. Яны называюцца "Нататкі вандроўніка". Калі на Свабодзе мне не хапала краязнаўчай інфармацыі, дык тут – адваротнае. Гучаць незлічоныя звесткі — хто, калі, у якім стагоддзі валодаў тым ці іншым мястэчкам. Усю гэтую інфармацыю, як я разумею, аўтар перадачы бярэ з кніжак ці з інтэрнэту і наўрад ці на ўласныя вочы бачыў усе тыя помнікі, пра якія гаворыць у эфіры. Вось напрыклад, 27 ліпеня прагучала перадача пра Мілавіды. Ізноў пачалося ўсё з ідыёцкай легенды пра "мілыя віды", што адкрыліся якомусьці рускаму цару, які там нібыта праязджаў. Потым – даўгі і нецікавы пералік энцыклапедычных звестак, а потым праз тэлефон далі слова якойсьці мясцовай жыхарцы Наташы. І тая не каб расказаць пра сучасныя краявіды і стан помнікаў той вёскі, дык расказала пра інспекцыю Кастусём Каліноўскім паўстанцкіх атрадаў 1863 году, быццам сама была сведкай тых падзеяў. Канчаткова дабіла тое, што на працягу перадачы разоў 20 не да месца паўтаралася застаўка "Нататкі вандроўніка".

4 жніўня на Еўрарадыё Святлана Адзінец чытала навіны і сказала такую вось фразу: "Беларусь павінна сплаціць парэшткі доўгу". Парэшткі – гэта штосьці звязанае з эксгумацыяй. А чым кепска проста "рэшткі" альбо "астача"?

**Сяржук Вітушка**

# ВЫГНАННЕ Ў РАЙ

Стрэмкі

## ЯК ДАЛІ, ТАК І АДАБРАЦЬ МОГУЦЬ

Жыў-быў вясковы шавец. І вырушыў ён аднойчы ў пілігрымку да Святой зямлі. І спаткаў па дарозе арханёла Гаўрыіла. Захацелася шаўцу пры такой нагодзе даведацца, а дзе ж ёсць рай і як ён выглядае.

"Найперш убачыш карчму", — кажа арханёл. Дзіўна стала шаўцу, што і ў раі ёсць корчмы, але маўчыць, далей слухае. А ягоны незвычайны суразмоўнік далей апавядае, якія там дарогі, хаты, сады. "Дык то ж мая вёска!" – вырвалася ў здзіўленага шаўца. "То вяртайся, чалавеча, назад, — мо паспееш, бо нядоўга засталося твайму раю існаваць на зямлі".

Такую казачку прыводзіць нямецкі пісьменнік Арно Сурмінскі ў адной са сваіх кніг пра Мазуры – цяпер польскія землі, а калісь, да вайны, — нямецкія. Дзяцінства аўтара там і прайшло.

Нядаўна давялося і мне наведаць гэтыя мясціны. А раней – бываў і на іншых землях, якія былі аддадзены Польшчы вялікадушнымі пераможцамі. Гадоў шэсцьсот таму яны належалі польскай кароне, і, вядома ж, польскія патрыёты пра гэта ніколі не забываліся. Як і нямецкія, якія за гэты час стараліся "выцерабіць" і найменшыя парасткі польскасці.

Новымі межамі не быў задаволены ніхто. Палякі атрымалі Ўроцлаў, Гданьск, Ольштын і іншыя гарады, але дагэтуль бядуюць па страчаных Вільні і Львове ("У Літве няма польскага гандлёвага прадстаўніцтва праз неабгрунтаваныя прэтэнзіі літоўцаў на Вільню" – радок з міжваеннага польскага школьнага падручніка геаграфіі). Беларусы атрымалі Заходнюю Беларусь, але марылі пра Вільню. Літоўцы атрымалі Вільню і Клайпеду, але хацелі б мець і Сувалкі. Ну і, вядома, немцы не могуць забыцца, адкуль Сталін, бы крошкі са стала, змахнуў ажно 15 мільёнаў.

Старыя-новыя землі трэба было кімсьці засяляць. Было прынята рашэнне дазволіць усім каталікам з заходніх абласцей СССР перасяліцца на вызваленыя тэрыторыі. Хто ехаў і праўда па сваёй ахвоце, марачы выратавацца ад сталінскага пекла, а хто ў "добровольно-принудительном" парадку. Саветы пазбаўляліся "гнілога элементу", а палякі займелі новых грамадзян.

І вось падарожнічаеш цяпер па гэтых вёсках з нязвыклымі для беларускага вока цаглянымі дамамі, крытымі дахоўкай, і ўсюды заўважаеш адзін і той жа абразок: як пасяліліся тут людзі паўстагоддзя таму назад, так і не дакрануліся ні да чаго. Стаіць домік – добра, развальваецца – няхай. Рукі не горнуцца. Чужое. А ў падсвядомасці варушыцца думка – як далі, так і адабраць могуць. Сёння прывезлі – заўтра вывезуць. То што пуп ірваць. Тым болей, не тут ён рэзаны, гэты пупок. А значыць, і старонка нямілая. Дый высветлілася, што й тут "калхозы", хай і называюцца іначай. І ўсё – чужое ўдвая.

Едзеш звыклай палявой дарогай. Звыклай, ды не зусім – бо выкладзена бетоннымі плітамі. Дзе-нідзе – прагалы. Спатрэбіліся камусь будаўнічыя матэрыялы. Дарога абсаджана старымі вербамі, але ніводнай цэлай – або абрэзаны па камель, або яшчэ й выпаленыя з сярэдзіны. Няма чаго шкадаваць фашыстоўскія дрэвы.

З дрэвамі ля дарог дагэтуль вядзецца вайна, як і ў Беларусі. Бо часта даводзіцца ад стогадовага камля адшкрабаць якую "мазду" ці "таёту", на якой п'яныя маладзёны вярталіся з "забавы" (так у Польшчы называюцца "танцулькі"). Але да перамогі над дрэвамі далёка. Бач, у немцаў такія дарогі былі ўсе. Да адной.

Я гляджу на гэтыя краявіды асаблівым позіркам. Бо гэта магла быць і мая радзіма. Мой бацька таксама хацеў выехаць. Яму, досыць заможнаму гаспадару, а ў вайну яшчэ й "рагулёўцу", нічога добрага ад бальшавікоў не "свяціла". Але ў апошні момант – ці то пісар памыліўся, ці "органы" паклапаціліся – не аказалася яго ў спісах...

І не давялося мне нарадзіцца ў чужым раі. І не ведаю, дзе яго шукаць – свой.

Але варта ўспомніць, што давялося пеpажыць нашым бацькам і дзядам – усе войны, ГУЛАГі, высяленні і пакуты, каб зразумець: мы з вамі жывем калі не ў раі, то не ў пекле дакладна. Пекла ўжо было.

**Алег Аблажэй**

# Фотафакт



**Гэтыя валуны** — *зусім не экспанаты музея камянёў. Гаспадары крайняй у вёсцы хаты прыцягнулі іх, каб бараніць сваё жытло ад «п'яных трактарыстаў», якія «на віражы» часцяком патраплялі проста ў зруб. Віцебшчына, Гарадоцкі раён, лета 2007 г.*

# Невядомая Беларусь

**10 жніўня** 1927 году ў Мінску з'езд праваслаўных святароў і вернікаў абвясціў Беларускую Аўтакефальную Царкву. Старшыняваў на з'ездзе біскуп бабруйскі Філарэт, бо ініцыятар аўтакефаліі мітрапаліт Мельхіседэк у той час сядзеў у бальшавіцкай турме. Да новастворанай Аўтакефаліі належала 407 святароў з іх прыходамі, г. зн. амаль усе прыходы Беларусі. Беларуская Праваслаўная Аўтакефальная Царква праіснавала 10 гадоў. У 1937 годзе усе святары былі арыштаваныя НКВД і расстраляныя або загінулі ў канцлагерах.

**11 жніўня** 1918 году Сакратарыят Беларускай Народнай Рэспублікі зацвердзіў нарматыўны варыянт дзяржаўнага бела-чырвона-белага сцяга. Закон быў апублікаваны ва ўрадавай газеце «Вольная Беларусь».

**13 жніўня** 1956 году пакінуў гэты свет народны паэт Беларусі Якуб Колас. Кажуць, на развітанне з класікам у мінскі Палац прафсаюзаў прыйшлі многія тысячы людзей.

**14 жніўня** ў Беларусі традыцыйна адзначаецца Першы або Мядовы Спас. Яшчэ ў народзе яго называюць Макаўе. Наступны Спас будзе адзначацца 19 жніўня. Ён мае назву Яблычны.

**14 жніўня** 1824 году расійскі цар Аляксандр І падпісаў прысуд удзельнікам тайных студэнцкіх таварыстваў філаматаў і філарэтаў. Згодна з прысудам, дзясяткі студэнтаў пайшлі на катаргу ў Сібір, асноўная ж маса трапіла пад нагляд паліцыі, нядобранадзейныя выкладчыкі выкідаліся з Віленскага ўніверсітэту. Сярод рэпрэсаваных былі студэнты Тамаш Зан, Ян Чачот, Адам Міцкевіч, якія ў будучыні прынясуць славу Беларусі, Літве і Польшчы.

**15 жніўня** 1972 году ў Мінску пры нявысветленых абставінах быў забіты мастак, лідэр нацыянальна-адраджэнскага руху Лявон Баразна.

# НЕСАЛІДНАЯ ГАЗЕТА

## ЯК ОРГАН АДМІНІСТРАЦЫІ ПРЭЗІДЭНТА

*Газеце "СБ" 80 гадоў. Што вы можаце сказаць на гэта? Можа гэта 80 год хлусні?*

**Ваш чытач Сяргей.**

За сваю гісторыю "Советская Белоруссия" некалькі разоў змяняла аблічча. Сёняшняя "СБ" створана паводле вобразу і падабенства свайго нязменнага галоўнага рэдактара Паўла Якубовіча – вядомага за савецкім часам фельетаніста і футбольнага аглядальніка.

У "СБ" спадар Якубовіч выпрацаваў канцэпцыю масавага грамадска-палітычнага выдання, узяўшы на ўзбраенне метады "нізкай прэсы" — папулярных часопісаў, якія пішуць пра кулінарыю, спорт, здароўе ці аўтамабілі. Кожны нумар цяперашняй прэзідэнцкай газеты поўны характэрных загалоўкаў: "В Кабуле все спокойно", "Два мгновения весны...", "Шенгенная инженерия", "Жатва не терпит суеты", "Паркуй железо, пока горячо!", "Не в бровь, а в Глазго", "В чем правда, блат?", "Если человек не идет к суррогату...", "Особенности национальной заботы", "Тоска объявлений", "Сайт уполномочен заявить", "Не верь, не бойся, не дрожи"...

Для параўнання можна ўзяць які-небудзь расейскі часопіс з вялікага мноства тых, што прызначаны для чытання ў цягніку і прадаюцца, галоўным чынам, на вакзалах, а там – цэлыя россыпы падобнай журналістыкі: "Кашель бьет без промаха" ці "Без права на лишний килограмм" ці "Пицца – застольня птица" ці "ОСАГО с человеческим лицом"... Стыль загалоўкаў – той самы, стыль артыкулаў – таксама. У літаратуры гэты стыль называюць перасмешніцтвам. Бярэцца знаёмы кожнай постсавецкай галаве штамп і перакручваецца на свой лад. У свой час такім перасмешніцтвам і займаліся савецкія фельетаністы. Але ў савецкіх газетах яны займалі строга вызначанае для іх месца – на апошняй паласе. У выпадку ж "Советской Белоруссии" гэты прыём быў ужыты татальна – для ўсіх палос і тэм. Як вынік – шалёная папулярнасць у публікі і... пустата пасля прачытання.

Перасмешніцтва заўжды другаснае, бо адштурхоўваецца ад першаўзора. Нічога арыгінальнага ці эксклюзіўнага ў такім жанры не можа быць паводле вызначэння.

У цалкам забаўляльным кантэксце "СБ" немагчыма ўявіць сабе сур'ёзны аналітычны матэрыял, які б выклікаў палеміку ў грамадстве. Бо аналітыкі "СБ" – таксама перасмешнікі. Напрыклад, калі жанчына-медык скардзіцца ў рэдакцыю на нізкія заробкі лекараў, дасужы газетны "аналітык" заўважае: дык і не ўсе ж лекары працуюць у медыцыне паводле прызвання! Калі б "аналітык" меў прозвішча Петрасян, чытачам упару было б разрагатацца над такой "аналітыкай", але прозвішча незнаёмае, і застаецца толькі неўразумела асцепануць плячыма.

У "СБ" не можа выказацца Асоба, якую хвалюе лёс краіны. Іх там не можа быць, бо яны – з іншага жанру, не перасмешнікі. Нават панылыя даклады ідэолагаў адміністрацыі Лукашэнкі, як зрэшты і спічы самога прэзідэнта, тут не ўспрымаюцца сур'ёзна – як гэта бывала ў савецкія часы, калі фельетону было адведзенае сваё месца, дырэктыве сваё, а на палосах іншы раз з'яўляліся сапраўды праблемныя тэксты.

Нават русіфікатарская роля, якую мусіць выконваць "Советская Белоруссия", падкрэслена несур'ёзная. Да прыкладу, кожны беларус, паводле "СБ", павінен ведаць, хто такі Гальцаў і ўспрымаць яго як свайго.

Фельетон чытаецца ўзахапкі, падымае настрой, але зараз жа вылятае з галавы, бо не мае ніякага дачынення да рэальнага жыцця.

Фармальна "СБ" можна было б аднесці да карнавальнай культуры постсавецкага часу. У прынцыпе гэта нармальна, бо і цыркавы балаган на базары – таксама патрэбная з'ява. Але – у свой час і ў сваім месцы. Калі ж гэты цырк называюць органам адміністрацыі прэзідэнта, робіцца яшчэ "весялей". Падсвядома стваральнікі "СБ" гэта ўсё, вядома, разумеюць. І каб адначасова не страціць сваёй масавасці і захаваць апеку першай асобы краіны, выстаўляюць рэкламны контрслоган: "СБ" – салідная газета!"

Насамрэч "СБ" не толькі не салідная, а падкрэслена несалідная газета. На яе аўтарытэт ніколі не спасылаюцца рэальна салідныя СМІ за мяжой, бо аўтарытэту ў "СБ" няма. Нельга, аналізуючы палітыку, эканоміку ці культуру, спасылацца на часопіс красвордаў ці газету кулінарных рэцэптаў. Але тое, што "СБ" несалідная, для яе самой – добра. Бо ніхто не пойдзе ў "салідны" цырк і не прыпыніцца каля "саліднага" базарнага балагану. Адсюль і неапраўданыя вінавачанні "СБ" у хлусні. Вы ж не станеце вінаваціць факіра, які выдыхае агнём пасярод базарнага балагана, што ён вас падманвае. Як нармальны чалавек, вы пазахапляецеся відовішчам і ўкінеце ў факіраву шапку свае тры, а можа, нават, і трыццаць тысяч.

**Сымон Музыка**

КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ СВАБОДУ ПРАЗ ПОШТУ, ДАШЛІЦЕ ВАШ ПОЎНЫ І ДАКЛАДНЫ АДРАС (ІНДЭКС, ГОРАД, ВУЛІЦА, ДОМ І КВАТЭРА) SMS-ПАВЕДАМЛЕННЕМ НА НУМАР +370 687 42185 АЛЬБО НА E-MAIL: EDIT@VILNIA.COM
КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ ЧЫТАЦЬ СВАБОДУ Ў ІНТЭРНЭЦЕ І Ў PDF-ВЕРСІІ, ЗАХОДЗЬЦЕ НА САЙТ WWW.VILNIA.COM
КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ PDF-ВЕРСІЮ СВАБОДЫ, ПАВЕДАМЦЕ НАМ НА E-MAIL EDIT@VILNIA.COM ВАШ ЭЛЕКТРОННЫ АДРАС.

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер" **Тыраж** 299 экзэмпляраў
**Галоўны рэдактар** А. Уласаў (email: edit@vilnia.com) **Падпісана ў друк** 08.08.2007 00:54
**Адрас** 220013 г. Мінск, пл.Каліноўскага 1а